ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка»

# ЛІТАРАТУРНЫМІ СЦЕЖКАМІ ЯЗЭПА ПУШЧЫ



рэкамендацыйна-бібліяграфічны паказальнік

МІХАНАВІЧЫ, 2023

**«Літаратурнымі сцежкамі Язэпа Пушчы»** [Тэкст]: Інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік / складальнік Н. Носова; рэд. Н.Няхай; мастак-аф. М.Янус; аддзел інфармацыйнага абслугоўвывання ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”. – Міханавічы. — 2023. — 12 с.

Рэкамендацыйна-бібліяграфічны паказальнік, прысвечаны паэту, крытыку, перакладчыку, члену саюза пісьменнікаў Беларусі, нашаму земляку — Язэпу Пушчы.

Прызначаны для шырокага колу чытачоў.

Сапраўднае імя: **Плашчынскі Іосіф Паўлавіч**

Псеўданімы: **Л.Кудзер; Язэп Кудзер; Лясун; Пушча; А.Пушча; Л.Трыер**



Дата нараджэння: **20.05.1902г.**

Месца нараджэння: **в. Каралішчавічы Мінскага раёна**

Дата смерці: **14.09.1964г.**

Месца пахавання: **Мінская вобл., Мінскі раён, в. Каралішчавічы**

Род заняткаў: **беларускі паэт, крытык, перакладчык**

Першыя крокі ў літаратуру Язэп Пушча зрабіў, калі ў 1923 разам з іншымі пісьменнікамі стаў адным з заснавальнікаў і арганізатараў літаратурнага аб'яднання "Маладняк", а пазней — "Узвышша".



З гэтага часу паэзія становіцца яго асноўным заняткам. Аўтар зборнікаў "Раніца рыкае", "Vita", "Дні вясны".

Для ранніх вершаў паэта характэрны тонкае лірычнае светаадчуванне, шырыня асацыяцый, дакладнасць вобразнага мыслення, светлыя радасныя фарбы, бадзёрасць і жыццесцвярджальнасць.

Туляўся выбоямі грэблі
заплаканы променя вырыс.
Апрануты латаным зрэб’ем,
у хаце мужычай я вырас.
Падслухаў там родныя песні,
як пелі дажынкамі жнеі.
Сахою я гонейкі песціў,
кілзаючы сонца у шлеі.
Прастор – сінявокі юнак –

да мяне прытуляўся ў сутонні;
губляючы зоры ў хмызняк,
яму снілася новае сёння.
Туман, ацярушаны пытлем,
цадзіў белаватую боязь.
Падпаскам, ганяючы быдла,
я раніцы кланяўся ў пояс.
Кудлата-зялёныя хвалі
чупрынаю кудзер кудзеліў, –
ветры ж мяне калыхалі
ў ядрана жытняй пасцелі.
Ўсміхалася Свіслач мне срэбрам,
на пуні прывязваў як прывязь.
Апрануты латаным зрэб'ем,
у хаце мужычай я вырас.

Уласцівыя маладнякоўскай паэтыцы арнаментальнасць і квяцістасць выявіліся ў многіх творах нязвычнымі метафарамі: ("Раніца рыкае", "Я раніцы кланяўся ў пояс", "Раніцу шчэбет пільнуе", "Усміхаецца зорамі ночка", "Туляўся ў выбоінах грэблі заплаканы променя вырыс", "Беланогі, расчухраны месяц лявоніць у лісці кляновым").

У гэтых метафарах, якія падчас мяжуюць з нечаканасцю, нават вычварнасцю, у пранікнёных інтанацыях адчуваецца не толькі захапленне паэзіяй С. Ясеніна, у чым вульгарызатарская крытыка абвінавачвала Язэпа Пушчу. У гэтай маладой задзірыстасці, нават свавольстве, угадваюцца палёт фантазіі, імкненне для кожнай грамадскай праявы ці з'явы прыроды знайсці сваё непаўторнае вобразнае тлумачэнне. У другой палове і асабліва ў канцы 20-х гадоў творчыя пошукі паэта ўскладніліся ў сувязі з нездаровай грамадскай атмасферай у

краіне, штучным распальваннем падазронасці, агульнага недаверу, варожасці ў адносінах паміж людзьмі, навешваннем ярлыкоў. Крытыкі-вульгарызатары вышуквалі песімістычна-упадніцкія настроі, трагедыйнасць у зборніку Язэпа Пушчы "Песні на руінах", асабліва жорстка крытыкаваліся яго "Лісты да сабакі".

Калі параўноўваць укладанне зборніка “Сады вятроў” з двухтомнікам, то бачна, што самыя славутыя вершы паэта, як напрыклад, цыкл “Лісты да сабакі”, за які паэта шалёна бэсціла тагачасная вульгарызатарская крытыка, у зборнік не трапілі. Затое трапілі савецкія вершы Пушчы, якіх насамрэч у паэта было не так шмат. Напэўна для таго, каб Пушчу было лягчэй вярнуць у актуальны літаратурны абсяг. Найлепшыя вершы ў зборніку – гэта, канешне, тыя, якія прысвечаны роднай Беларусі, яе маляўнічай прыродзе, бо нездарма паэт узяў псеўданім Пушча.

Люблю прайсці сцяжынкамі ляснымі,
Пад елкамі і соснамі густымі,
Пад клёнамі з лістамі залатымі,
Пагаманіць і з гэтымі, і з тымі…

І яшчэ не цяжка заўважыць, што ў гэтым зборніку выбранага досыць шмат вершаў пра саму паэзію і паэтаў. Напрыклад, ёсць вершаваныя звароты да Купалы, Пушкіна, Ясеніна, Райніса. Яшчэ ў 1929 годзе Язэп Пушча ў вершы “Паэзія мая” разважаў пра сваё гарэнне паэзіяй, пра душы пажар і пра тое, што пакіне ў спадчыну нашчадкам:

Гарыць душа, гарыць уся,
Не патушыць душы пажар.
Хто ты, паэзія мая?
Пакінем што народу ў дар?

Язэпу Пушчу пакінуць свой дар народу ўдалося. У віну паэту ставіўся сум па родных мясцінах; яго распіналі на крыжы за тое, што адарваўся ад вёскі, але і не прыжыўся да гарадскіх муроў. У такіх неспрыяльных абставінах напісаны паэмы "Крывавы плакат" (у пазнейшай рэдакцыі "Крывавы год") і "Сады вятроў" (1930), дзе ў форме дыялогу Грыміцкага і Мярохі вырашаецца праблема сапраўднай эстэтычнай вартасці мастацтва. Сутнасць яе — у служэнні мастака інтарэсам народа, сваіх сучаснікаў. У 1930 былі здадзены ў друк, але ў сувязі з арыштам не ўбачылі свет зборнікі Язэпа Пушчы "Мой маніфест" і "Грэшная кніга". У паэмах "Песня вайны", "Цень консула", "Крывавы год" увага аўтара скіравана да падзей імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў.

У паэме “Песні вайны” (1927-1928) узнаўляюцца драматычныя падзеі 1914-1915 гг., вырашаюцца праблемы вайны без героя, разбуранага Беларускага Дома, народа-выгнанніка і інш. Твор прасякнуты моцным антымілітарысцкім пафасам, занепакоенасцю лёсам простага чалавека.

У паэме шырока задзейнічаны пейзаж, які выконвае функцыю ўзмацнення, эскалацыі эмоцый, згушчэнні фарбаў:

У хмарах звіліся маланкі намітусь,
Выразнасцю дзікай асвечаны дні.
Бура-навальніца над возерам Свіцязь:
У хвалях шалеюць грымоты,
Хвалі змываюць пакорнасць і літасць.

Малюючы карціну чорнай, раз'юшанай навальніцы-вайны, Я. Пушча не шкадуе змрочных фарбаў, скрозь выкарыстаючы натуралістычныя апісанні:

Мужчынскага цела абрубак

На ложку жалезным ляжыць.
Хоць крывёю аплыў ён і брудам,
А хоча ўсё ж мучыцца-жыць.

Антыэстэтыка паэта апраўдана мастацкай задачай – стварыць аб'ёмны вобраз знявечанага, прызванага краю, куды прыйшлі голад, заняпад нораваў, гвалт, смерць:

Мы кормімся хлебам пратухлым, -
Народ абяднеў, анаглеў.
Пайшоў жабракамі па свеце,
Магілы жабрачыя скрозь.
Скарынку хлеба просім,
Як не… той дык бяром.
У душы і сэрцы восень;
Журба між пахмурных броў.
Дачок казакі гвалцяць,
А жонак смерць бярэ.

Паэт размяжоўвае паняцці “Расія”, “імперыя”, і “Маці-Краіна”, “Радзіма”, неаднаразова падкрэслівае непатрэбнасць і марнасць страшных ахвяр, якіх запатрабавала ў яго народа “дзікая стыхія”, – адным з матываў твора паўстае матыў братазабойчай вайны:

Мне сорамна неяк сягоння
І горна, пакутна ў душы.
Пакорна ішоў на агонь я
І брата за горла душыў.

Гераічнай барацьбе беларускага народа з фашысцкімі акупантамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны паэмы "Бор шуміць" і "Людвіся".

Наш запаветны бор —
Краса далін і гор,
Краса радзімы Беларусі,
Як даматканыя абрусы,
Як васількі на паясах,
Як цвет на верасах,
Як песня светлай долі
На шырокім на раздоллі.

Адарваны ад Беларусі, Язэп Пушча пісаў мала. І толькі пасля вяртання на радзіму ім напісана шмат вершаў светлай, "сонечнай" тэматыкі. Пасляваенная лірыка паэта вызначаецца аптымістычным настроем, мажорным гучаннем. Асноўныя яе матывы — любоў да Радзімы, шматгалоссе прыроды, услаўленне працоўнага энтузіязму

Прасторы, песні родныя,
Як рэкі паўнаводныя.
У надранні час бадзёры
Шумяць блакітныя азёры.
Крыніцы неўгамонныя,
Як нашы шумы хвойныя.
Стаяць дубы на варце.
Сябры, сяброў збірайце!
Шумяць бары высокія,
Ляцяць дахаты сокалы,
Нясуць на крылах песню,
І рады ўсе прадвесню.

Гэтая лірыка лёгка клалася на музыку. Песні на вершы Язэпа Пушчы напісалі І. Бараноўская, П. Падкавыраў, Ю. Семяняка і інш. Пісаў таксама творы для дзяцей (вершаваная казка "На Бабрыцы" і інш.). Частка спадчыны Язэпа Пушчы (зборнікі "Мой Маніфест" і "Грэшная кніга") загінула. Некаторыя рукапісы былі спалены сям'ёй у Каралішчавічах з-за боязі. Некалькі вершаў Язэпа Пушчы апублікаваны пасмяротна ва ўспамінах яго жонкі Станіславы.

**Аб жыцці і творчасці паэта:**


Амосава, Ю. Асоба і спадчына Язэпа Пушчы : сучаснае прачытанне / Юлія Амосава // Краязнаўчая газета. - 2022. — 27 мая. — С.1.

Амосава, Ю. І ўсё ж для роднай Беларусі хачу застацца я паэтам : сучаснае прачытанне / Юлія Амосава // Краязнаўчая газета . - 2022. — 27 мая. — С. 4 - 5.

Бараноўскі, М. Доўгае вяртанне Язэпа Пушчы / Міхаіл Бараноўскі // Краязнаўчая газета . - 2022. — 3 чэрв. — С. 5.

Плашчынскі Іосіф Паўлавіч // Памяць: гістарычна-дакументальная хроніка Мінскага раёна. – Мінск, 1998. – С.517.

Пушча Язэп // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т.Т.13. – Мінск, 2001. – С.141.

Пушча Язэп // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т.Т.5. / пад рэдакцыяй А.В. Мальдзіса. – Мінск, 1994. – С.80 – 81.

Пуща Язеп // Минская область: энциклопедия: в 2 т.Т.2. - Минск, 2007. – С. 526.

Пушча Язэп // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т.6 : Кн.1. – Мінск, 2001. – С. 11.

Пушча Язэп // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5т. Т.4. – Мінск, 1986. – С. 424.

Тулупов,С. Деревня, которой три столетия / Сергей Тулупов // Прысталічча. – 2009. – 20 мая. – С. 6.

Шарук, Д. Зорка нацыянальнай паэзіі / Дзіяна Шарук // Прысталічча. - 2022. — 5 кастр. — С. 11.

Шарук, Д. "Зорка нацыянальнай паэзіі" : выставочная дзейнасць Гатаўскай сельскай бібліятэкі-клуба да 120-годдзя з дня нараджэння Язэпы Пушчы / Дзіяна Шарук // Бібліятэка прапануе. - 2022. — №12. — С. 39.

Язэп Пушча / В.А. Максімовіч // Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя: вучэбны дапаможнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей ВНУ. – Мінск, 2006. – С. 326 – 348. Язэп Пушча // Пісьменнікі Савецкай Беларусі. – Мінск, 1970. – С.305.

Ярашэвіч, М. Шукальнік, наватар, авангардыст / Марыя Ярашэвіч // ЛіМ. Літаратура і мастацтва. - 2022. — 3 чэрв. — С. 10.

**Творы Язэпа Пушчы:**

Пушча, Язэп (паэт ; 1902—1964). Збор твораў : у 2 т. / Язэп Пушча ; рэдкалегія: С. а. Андраюк [і інш.].— Мінск : Мастацкая літаратура, 1993—1994.— 21 см.— Перад выпускнымі данымі аўтар: Пушча Язэп (Плашчынскі Язэп Паўлавіч).— ISBN 5-340-01029-5.— Т. 1: Вершы. Паэмы. Артыкулы, 1922—1930 / рэдактар тома Р. І. Барадулін ; уступны артыкул, укладанне, падрыхтоўка тэкстаў і каментарыі Л. М. Мазанік.— 1993.— 381, [1] с., [4] л. партрэт.— Бібліяграфія ў каментарыях: с. 342—368, бібліяграфія ў падрадковых заўвагах.— Анатаваны паказальнік імёнаў да раздзела “Крытычныя артыкулы” : с. 369—373.— Са зместу: паэмы: Песня вайны ; Цень Консула ; Крывавы год ; Сады вятроў.— 1000 экз.— ISBN 5-340-01030-9 (у пераплёце)

Пушча, Язэп (паэт ; 1902—1964). Збор твораў : у 2 т. / Язэп Пушча ; рэдкалегія: С. а. Андраюк [і інш.].— Мінск : Мастацкая літаратура, 1993—1994.— 21 см.— Перад выпускнымі данымі аўтар: Пушча Язэп (Плашчынскі Язэп Паўлавіч).— ISBN 5-340-01029-5.— Т. 2: Вершы. Паэмы. Пераклады. Крытычныя артыкулы, 1930—1963 / рэдактар тома Р. І. Барадулін ; укладанне, падрыхтоўка тэкстаў і каментарыі, храналагічная канва жыцця і творчасці Л. М. Мазанік.— 1994.— 461, [1] с., [4] л. партрэт.— Алфавітны даведнік твораў да 1—2 тт.: с.441—Паказальнік імёнаў да 1—2 тт.: с. 453—454.— Са зместу: паэмы: Бор шуміць ; Людвіся ; Успаміны пра Я. Пушчу: Добрае імя / А Звонак. З дзён далёкіх і блізкіх / С. Плашчынская.— 1000 экз.— ISBN 5-340-01031-7 (у пераплёце)

Пушча, Я. Адаму Міцкевічу : [верш] / Язэп Пушча // Душа мая тужлівая...: вершы і паэмы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – С. 201 – 202.

Пушча, Я. Бальзам жывой вады / Язэп Пушча // Сэрдцам роднага слова краніся / укладальнікі : М. Воінаў, К. Усовіч. – Мінск : Народная асвета, 1998. – С. 22.

Пушча, Я. Вечар асенні, вечар маўклівы : [верш] / Язэп Пушча // Душа мая тужлівая...: вершы і паэмы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – С. 195.

Пушча, Я. Вясна : [верш] / Язэп Пушча // Вясёлка. - 2022. — №5. — С. 10.

Пушча, Я. Вясновае : [верш] / Язэп Пушча // Душа мая тужлівая...: вершы і паэмы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – С. 196.

Пушча, Я.  Зашумелі лісты : [верш] / Язэп Пушча // Душа мая тужлівая...: вершы і паэмы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – С. 201.

Пушча, Я. Зоры мітусяцца, свецяць : [верш] / Язэп Пушча // Душа мая тужлівая...: вершы і паэмы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – С. 196.

Пушча, Я. Каханне, залатое каханне : [верш] / Язэп Пушча // Душа мая тужлівая...: вершы і паэмы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – С. 197 – 199.

Пушча, Я. Мастак : [верш] / Язэп Пушча // Душа мая тужлівая...: вершы і паэмы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – С. 200.

Пушча, Я. Мне чупрыны не хочацца звесіць  : [верш] / Язэп Пушча // Душа мая тужлівая...: вершы і паэмы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – С. 193.

Пушча, Я. Не заблудзіўся я ў цёмным лесе.... : [верш] / Язэп Пушча // Краязнаўчая газета. - 2022. — 27 мая. — С. 1.

Пушча, Я. Раніца : [верш] / Язэп Пушча // Душа мая тужлівая...: вершы і паэмы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – С. 193.

Пушча, Я. Раніцу шчэбет пільнуе : [верш] / Язэп Пушча // Душа мая тужлівая...: вершы і паэмы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – С. 194.

Пушча, Я. Рэчанька не спіць : [верш] / Язэп Пушча // Душа мая тужлівая...: вершы і паэмы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – С. 193.

Пушча, Язэп (паэт ; 1902—1964).. Сады вятроў : вершы і паэмы / Язэп Пушча. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. – 366, [1 ] с., [1] л. партрэт.— 5000 экз.— (у пераплёце)




**Пушча Язэп**
**Сады вятроў.**

*Аднатомнік аднаго заснавальнікаў беларускай савецкай паэзіі склалі лепшыя вершы і паэмы, напісаныя ім у розныя гады творчай дзейнасці.*




**Сэрцам народжаны спеў**

*У гэты зборнік увайшлі вершы для чытання ў X класе. Класічная паэзія Уладзіміра Жылкі, Уладзіміра Дубоўкі, Язэпа Пушчы, Петруся Броўкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі і Уладзіміра Караткевіча зацікавіць школьнікаў, настаўнікаў, студэнтаў і ўсіх аматараў прыгожага пісьменства.*




**Язэп Пушча**
**Творы**

*У кнізе прадстаўлена творчасць найбольш самабытных і яркіх паэтаў першай траціны XX стагоддзя — Уладзіміра Дубоўкі, Уладзіміра Жылкі і Язэпа Пушчы. Склаўшыся як творчыя асобы ў «Маладняку», а потым утварыўшы ў 1926 г. літаратурнае аб’яднанне «Узвышша» , яны сталі лідарамі літаратурнага працэсу 1920-х гг., паэтамі-наватарамі, якія смела выкарыстоўвалі стылістыку сучасных ім авангардных плыняў, эксперыментавалі са словам у пошуках новага мастацкага стылю, сугучнага ўзрушліва-«бурапеннаму» пераломў эпох.*




**Сярэбраныя галасы.**
**“Душа мая тужлівая ...”**

*Своеасаблівая анталогія паэзіі 20—30-х гадоў мінулага стагоддзя. Лёс пятнаццаці паэтаў, творы якіх увайшлі ў гэтую кнігу,*

***ДУ "Мінская раённая цэнтральная бібліятэка"***

***Адрас:*** а/г Міханавічы, вул. Школьная, 23

***Тэлефон:*** 515-29-72

***Час работы:***
понедельник – суббота: 10.00 – 19.00

***Выходныя дні:*** нядзеля

***Санітарны дзень:*** першая серада месяца

***Сайт:*** https://minskaya-rcb.by/

***ВКонтакте: Минская Рцб:*** https://vk.com/id483156480